


*Сяргей Альшэўскі*, Медыя Акадэмія

**Дэкаланізацыя ў школьнай адукацыі. З чаго пачаць?**

Дэкаланізацыя школьнай адукацыі – гэта актуальная і важная тэма, якая патрабуе ўсведамлення і разумення з боку бацькоў. У гэтым дакладзе мы звяртаем увагу на недастатковае разуменне бацькамі ў першую чаргу агульнай сутнасці адукацыі, а пасля сутнасці і значэння дэкаланізацыі ў кантэксце адукацыі.

У першую чаргу, даклад звяртае ўвагу на тое, што шмат якія бацькі не ўсведамляюць, што адбываецца ў сучаснай адукацыйнай сістэме і як гэта звязана з працэсам дэкаланізацыі. Яны могуць быць не азнаёмленыя з паняццем дэкаланізацыі, яе мэтамі і прычынамі. У выніку, бацькі не могуць паўнацэнна ўплываць на адукацыйны працэс сваіх дзяцей і не могуць падтрымаць іх у гэтым аспекце.

Мэтай дакладу з’яўляецца паказаць неабходнасць у першую чаргу бацькам распавесці базавыя прынцыпы сучаснай адукацыі. І толькі пасля ўсведамлення гэтых базавых паняццяў пераходзіць да працы з бацькамі над праблемай дэкаланізацыі. І паказаць, што дэкаланізацыя школьнай адукацыі неабходная для стварэння справядлівага, інклюзіўнага і разнапланавага навучання, якое ўлічвае і шануе розныя культурныя, гістарычныя і сацыяльныя кантэксты. Бацькі граюць важную ролю ў гэтым працэсе, таму іхнае разуменне і падтрымка з’яўляюцца неад’емнымі элементамі паспяховай дэкаланізацыі школьнай адукацыі.

Ключавыя словы: дэкаланізацыя, школьная адукацыя, разуменне бацькамі, раз’ясненне, інклюзіўнасць, справядлівасць.

*Алена Басалай,* Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт

**Прарок з суседняй дзяржавы ці на каго арыентуецца беларуская юрыдычная навука і адукацыя?**

У часы БССР беларуская навука і адукацыя, і не толькі юрыдычная, была падпарадкавана Маскве.

А беларускае заканадаўства было ні чым іншым, як прадаўжэннем вялікай усесавецкай справы, мэты і кірункі вызначаліся цэнтралізавана.

Больш за трыццаць гадоў Беларусь будуе ўласную дзяржаўнасць, фармальна юрыдычна ў краіне існуе ўласнае заканадаўства, якое павінна служыць інтарэсам беларусаў, нацыянальная навука і нацыянальная адукацыя.

Але не гледзячы на фармальныя атрыбуты самастойнасці, здаецца, што крыніца кіруючага пачатку не змянілася за гэты перыяд. У такой сітуацыі важным з’яўляецца пошук адказу на пытанне, якая прырода ў гэтай з’явы.

Даклад будзе прысвечаны вызначэнню і асэнсаванню праблемы ўплыву расійскай навукі і адукацыі на развіццё беларускай юрыдычнай навукі і адукацыі. А таксама пошуку шляхоў вырашэння праблемы.

*Валер Булгакаў*, часопіс ARCHE, Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт

**Беларусь у катэгорыях каланізатара і каланізаванага: літаратура і навука XIX ст. як крыніцы па каланіяльнай гісторыі**

Канструктыўны патэнцыял каланіялізму (як ажыццяўляецца інтэлектуальнае канструяванне калоніі?), як каланіялізм уплываў на пэўныя аспекты мастацкай творчасці. Літаратурны дыскурс як адлюстраванне культурных, эстэтычных, ідэалагічных стратэгій каланіялізму, у якіх прагаворвалася Беларусь, шырэй, не толькі з расійскага, але і з польскага боку. Каланіялізм не толькі канструяваў новыя паняцці і прэзентацыі, жыццёва важныя для нацыяналістаў (у прыватнасці, ён стварыў канкрэтную эпістэмалагічную мадэль, праз якую бачылася Беларусь), але таксама кідаў выклік усталяванаму сацыяльнаму і культурнаму парадку, спараджаючы рознага кшталту рэактыўныя рухі, у тым ліку беларускі нацыяналізм. Каланіялізм выклікаў да жыцця антыкаланіяльны ідэалагічны дыскурс супраціву, зараджэнне і развіццё якога з’яўляецца найбольш яскравай падзеяй у беларускай літаратуры XIX ст.

Важнай каланіяльнай стратэгіяй стала стратэгія прэзентатыўнага абмежавання. Як і сама Беларусь, яе жыхары беларусы паўставалі прымітыўнымі, ананімнымі, пазбаўленымі высакародных якасцяў істотамі,

якія церпяць нягоды і бедствы, а іх культура і мова надзяляліся сумнеўнай каштоўнасцю і маргінальным статутам. Русін-беларус уяўляўся наіўным і прастадушным простым чалавекам, які лёгка паддаецца маніпуляванню. Беларусы надзяляліся ментальнасцю прыгнечанага бездапаможнага племені, арганічна няздольнага да самастойнага развіцця, племені, якое патрабавала пастаяннай апекі з боку нацыі, якая знаходзіцца на больш высокім узроўні развіцця.

*Сцяпан Захаркевіч,* Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт

**Апрыяцыя культурнай спадчыны і рэпрэзентацыя этнічных меншасцей у нацыянальным пантэоне Беларусі: па старонках школьных падручнікаў па гісторыі Беларусі.**

Паводле перапісу насельніцтва 2019 года ў Рэспубліцы Беларусь пражывае 82% беларусаў. Гістарычна ў Беларусі жылі таксама армяне, рускія стараверы, татары, цыгане, шатландцы, літоўцы, латышы, немцы і іншыя. Усе гэтыя калектывы аказалі ўплыў на культуру Беларусі, а некаторыя іх прадстаўнікі набылі сусветную вядомасць. Пасля здабыцця Беларуссю незалежнасці ў 1991 г. пачала актыўна фарміравацца нацыянальная гістарычная міфалогія. Вяліся вялікія дыскусіі пра герояў нацыянальнага пантэону. Важным інструментам для гэтага з’яўляюцца школьныя і ўніверсітэцкія падручнікі па гісторыі, у якіх вядомыя прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў у Беларусі альбо ігнаруюцца, альбо па змаўчанні трактуюцца як беларусы. Такім прыкладам могуць быць знакамітыя габрэйскія мастакі Марк Шагал і Хаім Суцін.

Яшчэ адзін такі прыклад, кананічны прадмет нацыянальнага гонару беларусаў – слуцкія паясы. Гэта найважнейшы статусны атрыбут шляхецкага касцюма XVII – XVIII стагоддзяў, які ствараўся з дарагіх тканін, часта з выкарыстаннем золата. Сёння слуцкія паясы прызнаны найважнейшай гісторыка-культурнай спадчынай Беларусі. Найбольш важнае і непасрэднае дачыненне да стварэння слуцкіх паясоў на Беларусі мелі армяне Ян і Леон Маджарскія (бацька і сын). Аднак публічна прынята «замоўчваць» армянскія карані беларускай гісторыка-культурнай спадчыны, акцэнтуючы ўвагу на значнасці саміх паясоў для культуры Беларусі.

Такія механізмы ацэнкі і выкарыстання як прадстаўнікоў этнічных меншасцяў Беларусі, так і іх культуры завязаныя не толькі з чыста палітычным вымярэннем, але і з шырока ўкаранёным дыскурсам прымардыялізму як трактоўкі нацыянальнага пытання ў Беларусі.

*Уладзіслаў Іваноў*, Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт

**Дэкаланізацыя пачынаецца з мовы**

Найбольш складаным і пры гэтым вельмі важным напрамкам любой дэкаланізацыі з'яўляецца моўны напрамак, дэкаланізацыі мовы. Складаным, бо моўныя практыкі не падуладныя законам, ад моўных звычак складана адмовіцца, нават калі прыняць закон і забараніць слова ці шэраг словаў. Звычайна пад дэкаланізацыяй беларускай мовай падразумяваецца перадусім пазбаўленне ці адмова ад русізмаў у лексіцы, сінтаксісе, стылістыцы, абумоўленых палітыкай русіфікацыі і моўнай эрозіі, мінімізацыя ўплыву трасянкі на беларускую мову, рэабілітацыя забароненага стандарту – напрыклад, тарашкевіцы, задзейнічанне альтэрнатыўных рэсурсаў мовы – лацінкі. Радзей уздымаюцца іншыя тэмы, звязаныя з дэкаланізацыяй мовы: пытанні сімвалічныя і палітычныя, якія закранаюць, напрыклад, тэму перадачы з улікам беларусацэнтрызму беларускіх назваў геаграфічных на замежныя мовы. Пытанне транслітарацыі, раманізацыі наагул уласных назваў геаграфічных, якое нібыта было вырашанае ў 2010, дзякуючы намаганням такім мовазнаўцам, як Валянціна Лемцюгова, у красавіку 2023 году зноў усплыло ў позве дня, калі па палітычнай волі рэжымам Лукашэнкі быў скасаваны закон аб назвах геаграфічных аб'ектаў 2010 году.

Адукацыя, у тым ліку вышэйшая, акадэмія шырэй гледзячы – гэта той далікатны і важны рэсурс, які мае ўплыў на (рэ)фармаванне дэкаланіялісцкіх практыкаў і і іх выкараненне. У адсутнасць дзяржаўнай палітыкі па дэкаланізацыі незалежная акадэмія, у прыватнасці ЕГУ, мае вялікую адказнасць і прывілей адначасова ажыццявіць дэкаланізацыю ў сферы не толькі адукацыі, але і мовы: беларускай перадусім.

*Максім Каралёў,* Інстытут гісторыі Польскай акадэміі навук

**«Не будзьце мудрымі самі з сабой»: ці магчыма дэкаланізацыя акадэмічных гуманітарных даследаванняў у Беларусі**

Існуючая сёння ў Беларусі сістэма адукацыі і навуковых даследаваннях пераважна транслюе зададзеныя ў савецкі час трэнды і наратывы, што не дазваляе паўстаць уласнай нацыянальнай сістэме. Выціснутыя, калі не за мяжу, то прынамсі па-за ўніверсітэцка-інстытуцкія структуры інтэлектуалы, якія прапаноўваюць іншы погляд на свет, моцна

дыскрэдытуюцца рэжымам. Усё гэта садзейнічае дэградацыі сацыяльнай і гуманітарнай думкі.

Уяўляецца, што ў Новай Беларусі неабходна будуць запушчаныя працэсы дэкаланізацыі адукацыі і навуковых даследаванняў. Але ці прынясе гэта вынік? Змены магчымыя там, дзе ёсць адчуванне іх неабходнасці. Не відавочна, што пэўная незадаволенасць прафесарска-выкладчыцкага складу сучасных беларускіх ВНУ прадугледжвае змены менавіта ў гэтым кірунку. А замяніць адразу ўсіх немагчыма. Не відавочна, што ў асяродку ўніверсітэцкіх выкладчыкаў і навукоўцаў існуе кансэнсус у разуменні таго, што лічыць праявамі каланіялізму і як гэтага можна пазбыцца (калі ўвогуле трэба пазбывацца). Інтэлектуальныя разважанні аб дэкаланізацыі могуць быць прынятыя за «заходнюю дурасць» як сённяшнімі супрацоўнікамі ВНУ, так і грамадствам, дзе будзе адчувацца ўплыў лукашэнкаўскай і расійскай прапаганды. У выніку можа ўзнікаць sui generis ізаляцыя прагрэсіўнай інтэлектуальнай думкі і кансервацыя па нязначных зменах існай сістэмы адукацыі і навукі.

Пунктамі выйсця з сітуацыі можа быць шырокая грамадская дыскусія на фоне масавай папулярызатарскай дзейнасці.

*Павел Котаў,* Palacký University Olomouc

**Neznámá zemĕ. Беларусь у чэшскім культурна-гістарычным уяўленні.**

Даклад базуецца на амаль 20 гадовым досведзе аўтара ў галіне чэшскай універсітэцкай адукацыі (спачатку як студэнта, пазней як выкладчыка спецкурсаў па беларускай мове, гісторыі Беларусі і гісторыі Украіны ў Карлавым універсітэце ў Празе і Ўніверсітэце Палацкага ў Оламаўцы) і прысвечаны месцу якое займае беларусістыка ва ўніверсітэце і шырэй у чэшскім культурна гістарычным уяўленні. Нягледзячы на доўгую гісторыю чэшска-беларускіх сувязей Беларусь знаходзілася на перыферыі зацікаўленняў пры гэтым разглядаецца перадусім праз прызму гісторыі суседзяў: Расіі і Польшчы. Аднак усплёск зацікаўленасці выклікаюць палітычныя падзеі ў рэгіёне (Беларускія пратэсты 2006 і 2020, Рэвалюцыя годнасці ва Ўкраіне і расейская агрэсія). Беларусістыка пры гэтым застаецца не істуцыялізаванай. Выклікам і задачай бачыцца інстытуцыянальнае і метадычная эмансіпацыя ад расейскіх даследаванняў. Адасабленне інстытуцыянальнае ў класічным варыянце зараз (кафедра) з’яўляецца немагчымым, і выхад трэба шукаць у іншых формах. Адасабленне метадычнае г. зн. каб для азнаямлення з гісторыяй і культурай Беларусі не патрабавалася веданне расейскай мовы, можа быць дасягнутае

перакладамі ключавых тэкстаў як крыніц, так і літаратуры на англійскую мову.

*Олександр Кравченко,* Харківська державна академія культури

**Українська культурологія: парадокси академічного транзиту та перспективи деколонізації.**

Культурологія має понад тридцятирічну історію існування в академічному просторі Україні, проте залишається незавершеним проєктом, який потребує подальшого його ідентифікації. Ідеться не лише про її суб'єктність серед «наук про культуру», а й про її гносеологічну результативність; не лише про специфіку методологічного інструментарію, а й про зміст культурологічного знання; не лише про інституції, у яких вона існує, а й про їх соціальну ефективність. Ретроспективний погляд на культурологію в Україні дозволяє визначити її внутрішні суперечливість. За часом та обставинами виникнення культурологія є пізньорадянським проєктом трансформації ортодоксальних ідеологем у вищій освіті в академічно респектабельний дискурс культури. Концептуально вона тяжіє до трансдисциплінарноті. За формами інституалізації – це пострадянський транзит ідеї специфічної наукової рефлексії культури. За епістемологічними ознаками – це теоретичний та методологічний трансферт досліджень культури. Як навчальна дисципліна, вона успадкувала радянську тематичну матрицю та функціональну ангажованість. Як дослідницька практика, вона є інклюзивною сферою інтелектуальної творчості з невизначеним об'єктом, ретроспективною методологією та розмитими критеріями науковості. Як спеціальність вона є міждисциплінарним міксом, який на набув змістової цілісності та соціальної визначеності. З появою культурології мала би відбутися модернізація системи знань про культуру в пострадянській освіті і науці. Проте ресурс інновацій виявився обмеженим. Зважаючи на академічну паліативність культурології та її залежність від успадкованих або запозичених аналітичних моделей культури, на часі є: деколонізація структури та змісту, деконструкція методології та теорії, емансипація практик культурологічної освіти.

*Аляксей Ластоўскі*, Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт / Упсальскі ўніверсітэт

**Беларускі гістарычны наратыў: дэкаланізацыя ці посткаланіялізм?**

Відавочна, што расійская агрэсія ў Украіне вымушае нас прынцыпова перагледзець многія важныя аспекты мыслення і самавызначэння, у тым ліку (і ці не ў першую чаргу) – гісторыі. Ва Украіне востра ставіцца зараз пытанне дэкаланізацыі гісторыі, што таксама з'яўляецца інтэлектуальным выклікам і для беларускага гістарычнага наратыву. У дадзеным выпадку я хацеў бы звярнуць увагу да сюжэту інтэлектуальнай гісторыі Беларусі, звязанага з зацікаўленнем посткаланіяльным падыходам, які меў некаторы час моцнае ўздзеянне на філасофскія і сацыялагічныя канцэпты беларускай ідэнтычнасці. На жаль, мы бачым практычна поўнае ўхіленне беларускай гістарыяграфіі ад тэарэтычных дыскусій, і гэтыя магчымасці посткаланіяльнага падыходу практычна не былі заўважаныя беларускімі гісторыкамі. У сваім дакладзе я паспрабую звязаць разам – распрацоўкі посткаланіялізму ў беларускім інтэлектуальным асяроддзі, выклікі дэкаланізацыі і абмежаванні існуючага гістарычнага наратыву.

*Юрій Латиш*, European Humanities University

**Деколонізація історичної пам'яті під час російсько-української війни**

Для виправдання агресії проти України російська влада використовує «історичні аргументи». Російські політики, журналісти та історики заперечують існування українського народу і української мови, стверджують, що українська держава не має своєї історії та права на існування, висувають концепції «русского мира», Новоросії (території півдня України, які нібито мають належати Росії)), розділений російський народ, України як нацистської держави тощо. У відповідь під час війни Україна проводить політику мнемонічної деколонізації.

Головною складовою української політики пам'яті під час війни є деколонізація, як продовження декомунізації, яка розпочалася у 2015 році, та стихійної дерусифікації, ініційованої окремими місцевими органами влади та правими активістами після повномасштабного російського вторгнення. Деколонізація пам'яті передбачає вилучення з публічного простору символів – імен та меморіальних знаків, які вважаються маркерами російської імперської політики. Україна хоче позбутися впливу російської історіографії, а також сформувати власний національний історичний наратив і політику пам'яті, пов'язану з європейською традицією.

Реалізація політики пам'яті України під час війни включає такі складові:

– законодавче та нормативне регулювання історичної пам'яті (Закон «Про засудження і заборону пропаганди російської імперської політики в Україні

та деколонізацію топоніміки та інші), участь держави у створенні концепцій «рашизму» та геноциду українського народу російською армією (Постанова Верховної Ради України «Про визначення політичного режиму, що існує в Російській Федерації як рашизму та засудження його ідеологічних засад і суспільних практик як тоталітарних та людиноненависницьких»);

– знищення пам'яток, перейменування топонімів, пов'язаних із Росією та СРСР;

– встановлення пам'ятників та пам'ятних знаків жертвам російської агресії;

– переосмислення свят;

– використання медіа та масової культури для популяризації історичних наративів (марафон «Єдині новини», пісня «Батько наш Бандера»);

– зміни в шкільному курсі історії (центральним наративом стає колоніальний статус України у складі Росії/СРСР);

– вилучення російської та радянської літератури з бібліотек.

*Андрэй Лаўрухін,* Institute for Development and Social Market In Belarus and Eastern Europe

**Каланізацыя і аўтакаланізацыя акадэмічнай супольнасці Беларусі расійскім навукова-адукацыйным дыскурсам**

Сфера адукацыі Беларусі заўжды знаходзілася пад значным расейскім уплывам, які яскрава праяўляўся ў арыентацыі пераважнай большасці чынавенства і акадэмічнай супольнасці Беларусі на расійскія цэнтры адукацыі і навукі, расійскія выданні і індэксы цытавання (РІНЦ), расійскія навучальныя праграмы і навуковыя даследаванні. Далёка не ў апошнюю чаргу гэта звязана з тым, што ў Беларусі савецкі досвед стаў дамінуючым і па сутнасці адзіным досведам універсітэцкай культуры, а таму непазбежным чынам ацэньваўся і ўспрымаўся вельмі пазітыўна – як фактар мадэрнізацыі. У гэтай сітуацыі гарызонт магчымасцяў рэфармавання сістэмы адукацыі таксама быў абмежаваны савецкім перыядам і ўсе наватарскія ідэі сустрэты з падазрэннем не толькі чыноўнікамі ад адукацыі, але і акадэмічнай супольнасцю. Адзін з яркіх прыкладаў сілы гэтага ўплыву прыведзены ў даследаванні А. Коўзіка і М. Уотса: у пачатку 1990-х гг. у якасці стандартаў для выкладання былі ўзяты стандарты Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэту (Коўзік, Уотс 2003: 61).

З пачаткам ваеннай агрэсіі Расіі ва Украіну, адукацыйная сфера Беларусі ператварылася ў поле канстыентальнай вайны за светаразуменне і ідэнтычнасць беларусак і беларусаў. У сілу ізаляцыі і самаізаляцыі сістэмы адукацыі Беларусі ў адносінах да заходніх краін з развітой дэмакратыяй,

інтэграцыя ў расейскую адукацыйную прастору становіцца безальтэрнатыўнай. Гэтаму садзейнічае праактыўная адукацыйная палітыка РФ, накіраваная на фінансавую, тэхнічную і інфраструктурную падтрымку сістэмы адукацыі Беларусі, яе сінхранізацыю і ўніфікацыю з расійскай сістэмай адукацыі. У дакладзе будзе прадстаўлена актуальная сітуацыя ў сістэме адукацыі Беларусі і высветлены ключавыя фактары і матывацыі, якія спрыяюць каланізацыі і аўтакаланізацыі беларускай акадэмічнай супольнасці расійскім адукацыйным і навуковым дыскурсам.

*Алена Маркава*, Карлаў Універсітэт, Прага

**Дэкаланізацыя, дэсаветызацыі і нацыятворчасць у беларускай школьнай адукацыі перыяду нацыянальнай эмансіпацыі (1990-1994/95): вопыт, пераасэнсаванне і (ня)вывучаныя ўрокі?**

Мэтай даклада з’яўляецца аналіз і пераасэнсаванне вядучых канцэпцый нацыянальнай школы і нацыянальнай сістэмы адукацыі, якія былі створаны на працягу кароткага перыяду постсавецкай нацыянальнай эмансіпацыі і існавання парламенцкай Рэспублікі Беларусь (1990-1994/95). Гэтыя канцэпцыі, новыя метадалагічныя і іншыя падыходы распрацоўваліся як адказ на цалкам новыя выклікі, звязаныя з неабходнасцю дэкаланізацыі і дэсаветызацыі аўтарытарнай савецкай школы, адукацыі і выхавання, уваходжання ў новы еўрапейскі кантэкст (гістарычных даследаванняў, філасофскай думкі, навукі, адукацыі і г.д.), а таксама як адказ на неабходнасць стварэння новага канона беларускай нацыянальнай гісторыі і ідэнтычнасці (ці нацыянальнай свядомасці). Многія з гэтых падыходаў і канцэпцый (уключна новых падручнікаў) былі пасля 1994/95г. адрынутыя ў кантэксце распачатага вяртання да расійскацэнтрызма ці пра-расійскага ўплыву. Асноўнае пытанне дакладу з’яўляецца наступным:

Як ажыццяўлялася дэкаланізацыя ў адукацыі? Якія метадычныя падыходы і элементы, прапанаваныя для дэсаветызацыі і дэкаланізацыі ў перыяд нацыянальнай эмансіпацыі, з’яўляюцца і сёння рацыянальнымі і жыццяздольнымі? Які метадалагічны і іншы вопыт не згубіў свайго патэнцыяльна і сёння? Як вытваралася суб’ектнасць новай гісторыі і нацыянальнай школы? Як выглядала мадэль новай нацыянальнай ідэнтычнасці і ці можа яна быць выкарыстана сёння? Як суадносіўся і як павінен суадносіцца сёння нацыянальны і над-нацыянальны кантэкст школы і звязаных гуманітарных даследаванняў? Які вопыт можна

выкарыстаць і імплементаваць зараз? І, нарэшце, як павінна выглядаць новая школа і будучая рэформа сістэмы адукацыі ў Беларусі?

*Іван Новік*, Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт

**Посткаланіяльная тэорыя як метадалогія і практыка гісторыі беларускай філасофіі.**

Гісторыя беларускай філасофіі, як акадэмічная галіна сучаснай беларускай навукі, мае падвоеную генеалогію. Непасрэдна ўзыходзячы да паваеннага праекту «гісторыі народаў СССР» і, такім чынам, вонкава ўбудаваная ў ландшафты «постсавецкай» вытворчасці гуманітарнай веды, у якасці парадыгмальнага для сябе яна арыентуецца не толькі на тэксты выбітных прадстаўнікоў «Гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі», але і на «Западнорусизм» А. Цвікевіч, на заяўленыя апошнім прынцыпы прачытання лакальнай інтэлектуальнай гісторыі: а) тэрытарыяльны прынцып (усё паўсталае цягам гісторыі на абсягу сучаснай Беларусі мусіць разглядацца як легітымны аб’ект даследавання, незалежна ад нацыянальных, лінгвістычных і канфесіянальных прынцыпаў); шырокі гарызонт канцэптуалізацыі (не толькі ўласна філасофскія тэксты, але і ўсе значныя інтэлектуальныя падзеі і артэфакты) – што набліжае яе хутчэй да сучасных дысцыплінаў інтэлектуальнай гісторыі / гісторыі ідэй, а не класічных гісторыка-філасофскіх праектаў; крытычная оптыка, у дусе шырока зразуметай марксісцкай герменеўтыкі падазрону – спроба інтэрпаляваць гісторыю вытворчасці веды на розныя каланіяльныя і эканамічныя трэнды.

На сучасным этапе (г. зн., кажучы аб гадах незалежнасці Беларусі) гісторыя беларускай філасофія разглядае свой аб’ект – беларускую культуру ў яе гістарычным вымярэнні – як зыходна і непазбыўна полігласічны (не толькі шматмоўнасць традыцыі, але і гетэрагеннасць прадстаўленых у ёй ідэалагічных і культурных «галасоў»), трансгранічны (інтэлектуальная прастора Беларусі, як вынік налажэння і інтэрферэнцыі некалькіх палітычна-культурных, каланіяльных у тым ліку, праектаў), карыстаючыся пры гэтым метадалогіяй аналізу і дэканструкцыі адносінаў цэнтр-перэферыя.

Усё гэта дазваляе нам казаць, што дэкаланіяльныя стратэгіі не толькі запатрабаваны ў далейшым даследаванні інтэлектуальнай гісторыі Беларусі, але ўжо часткова рэалізуюцца ў межах праекту гісторыі беларускай філасофіі.

*Сняжана Рогач*, фрылансер

**Памылковыя рызыкі дэкамунізацыі/дэсаветызацыі з «левага» пункту гледжання**

Частка краін Еўропы ўжо праходзілі на палітычных этапах свайго развіцця спробы так званай «дэкамунізацыі» ці «дэсаветызацыі». У першую чаргу, маюцца на ўвазе краіны Цэнтральнай і Ўсходней Еўропы, дзе з канца 1989 г. і ў 1990-я дэмакратызацыя, лібералізацыя, рынак абгрунтоўваліся неабходнасцю адыходу ад галоўных прынцыпаў дзяржаўнага кіравання ў СССР.

«Дэкамунізацыя» разумелася як адмова ад сімвалаў, імёнаў, назваў, лозунгаў КПСС, як змена сацыяльна-гуманітарных дысцыплін і перапісванне падручнікаў, але таксама і больш шырэй – адыход ад камуністычных ідэй, а часам і поўная іх забарона ў краінах. Але гэта таксама мае небяспеку ідэйнага зрушэння ў «правы» палітычны бок, са зніжэннем ролі сацыяльна накіраваных партый, вяртанню карсерватыўных умяшанняў у рэпрадуктыўную палітыку, у асвету, навуку, звужэнню магчымасцей для значнай часткі насельніцтва ў атрыманні безграшовай пасляшкольнай адукацыі, змяншэнню колькасці медыкаў і даступнасці медыцыны.

Унёсак такіх падыходаў у акадэмію можа сыграць яшчэ больш негатыўную ролю для грамадства. Крытычнае пераасэнсоўванне праграм, крыніц і падручнікаў па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах усё ж такі не павінна даводзіць да адмовы ад «левых» ідэй і аналітычных канцэпцый, а нават наадварот – дакладна зараз, улічваючы часовую адлегласць ад СССР, спрабаваць вызначаць і ўлічваць сацыяльныя плюсы, якія атрымала большасць насельніцтва савецкіх рэспублік, але спрабаваць глядзець на іх з больш шырокага геаграфічнага фокусу і ў кантэксце сваёй краіны, а таксама з крытычнай заўвагай да метадаў рэалізацыі ў савецкі час тых праграм (Фукуяма).

Цікава, што павярхоўнае прыроўніванне, атаясамленне «дэкамунізацыі» і «дэсаветызацыі» не дае магчымасці звярнуць увагу і ўлічваць тое, што саветы ў СССР на самой справе не мелі ўлады, а ў частцы дзейнасці Крамля ў розны час мела значна кансерватыўныя рысы. Але гэтыя нюансы таксама было б добра ўпісаць у падручнікі, якія будуць распрацоўвацца ў бліжэйшы час.

*Ніна Скеп'ян,* Základní škola Rabasova, Slaný

**Распрацоўка спецыяльнасці па вывучэнні Беларусі для чэшскай вышэйшай школы**

У дакладзе будзе звернутая ўвага на культурнае дамінаванне былых метраполій у посткаланіяльны перыяд, што садзейнічае захаванню стэрэатыпаў і нацыянальнай няроўнасці. У прапанове стварыць курс, прысвечаны вывучэнню Беларусі і іншых краін былога Савецкага Саюзу, бачыцца шлях да больш збалансаванага і справядлівага асэнсавання культурных перспектыў былых калоній. Такі курс можа садзейнічаць фарміраванню інклюзіўнага акадэмічнага асяроддзя, якое зможа даследаваць унікальны ўклад гэтых краін у агульную еўрапейскую гісторыю.

У большасці еўрапейскіх універсітэтаў, у тым ліку факультэтах славістыкі, асноўная ўвага надаецца рускай культуры, што прыводзіць да недастатковага ўяўлення аб іншых постсавецкіх краінах. Прапанаваны курс дасць магчымасць устараніць гэты дысбаланс, прадставіўшы платформу для паглыбленага вывучэння культуры і літаратуры Беларусі і іншых краін былога Савецкага Саюзу. Прапаноўваючы комплексны і аб’ектыўны навучальны план, мы зможам павялічыць акадэмічную разнастайнасць і садзейнічаць мультыкультурнаму разуменню.

Неабходнасць увядзення курсу, прысвечанага вывучэнню Беларусі і іншых краін былога СССР, абумоўлена пераадоленнем гістарычных прадузятасцей, выпраўленнем пачуцця непаўнавартасці, карэкцыяй міжнародных уяўленняў і пераадоленнем дамінавання расійскіх даследаванняў. Як комплексны і інтэграваны адукацыйны досвед, курс дазволіць студэнтам крытычна аналізаваць і ацэньваць багатую гісторыю і культуру гэтых краін. У канчатковым выніку гэта спрыяе больш справядліваму і збалансаванаму ўяўленню розных пунктаў гледжання ў акадэмічных колах.

*Тарас Ткачук, Анастасія Онатій,* КВНЗ "Вінницька академія безперервної освіти", Національний університет "Києво-Могилянська академія"

**Вплив ідеології на зміст та форму підручників з української мови**

У системі освіти предмет українська мова традиційно був тісно пов’язаний з політичною ідеологією та владою. Підручники української мови, створені за тоталітарного режиму СРСР, пропагували особливий набір оцінних установок і думок, відомих як радянська пропаганда. Ідеологічне підґрунтя закладено і в підручниках української мови, написаних у незалежній Україні.

Наше дослідження має на меті проаналізувати вплив тоталітарної ідеології на зміст підручників з української мови, офіційно затверджених і виданих у 1955 р. («Українська мова для 4 класу» С. Чавдарова), 1985 р. («Українська мова для 5-6 класів» О. Блика та Б. Кулика), 1992 р. («Рідна мова для 5 класу» Г. Передрій, Л. Скуратівський та ін.). Вибрані підручники ілюструють три періоди радянської та пострадянської історії: сталінську добу, період відбудови, або «перебудови», та перші роки незалежності України після розпаду Радянського Союзу.

Застосовуючи порівняльний контент-аналіз зображень, текстів і завдань, у цьому дослідженні обговорюємо ідеологічне підґрунтя, закладене в підручниках з української мови. Висновки доводять, що явний ідеологічний наратив домінує в дизайні та змісті підручників мови, написаних і виданих у радянський період. Крім того, це дослідження підкреслює, що імпліцитний ідеологічний наратив все ще відображений у підручниках, написаних і виданих у пострадянський період. Водночас автори та дизайнери підручників ранньої незалежної України запроваджують новий тип контенту, який оприявнює раніше заборонені теми та демонструє різноманітні патріотичні та націоналістичні ідеологічні моделі.

Пропозиції та рекомендації, запропоновані в цьому дослідженні, допоможуть розробникам підручників уникнути упереджених ідеологічних моделей, які нав'язують єдиний набір ставлень, переконань і цінностей, замість того, щоб заохочувати учнів до формування власної думки.

*Kate Antanovich*, The Pennsylvania State University

**Multiple projects of decolonization: Towards a better understanding of Belarusian past and present.**

Although there is a large body of research that explores how education aided (Willinsky, 1998) or challenged (Borges, 2019) imperial projects and colonial dependence globally, postcolonial research on Belarusian education is lacking. In this presentation I address this gap and illustrate how education fostered colonial dependence in Belarus. Because decolonization involves uncovering colonial processes of the past and reshaping notions and mental maps of the present, I divide my presentation in two parts and illustrate the potential postcolonial educational research holds for either project.

Since historically different regions of Belarus have been parts of various state formations, a comprehensive decolonization project needs to investigate how multiple empires impacted Belarusian subjectivity. In the first part of the

presentation, I use existing historical scholarship to discuss how Polish, Russian, and Soviet empires used education to promote geopolitical allegiances and language choices among the Belarusian population.

Decolonization of knowledge in the Belarusian context implies development of the conceptual apparatus adequate to understand local condition and reflective of the indigenous ways of knowledge production. In the second part, I draw on my ongoing dissertation research that collects Belarusian teachers' life histories to examine their notions of professionalism. Stories have been an important Belarusian indigenous method of knowledge transmission to resist and preserve memory of events that contradicted official history (Smalianchuk, 2018). I discuss methodological and theoretical challenges post-Soviet researchers encounter as they attempt to understand the present situation and reflect on my experiences in Western academic institutions to outline affordances and constraints Western academia offers to scholars working on Belarusian issues.

*Andrei Gornykh*, European Humanities University

**Dialectics of Internal Colonization**

Russia's Imperial Experience, described by Alexander Etkind, has given rise to widespread controversy regarding the genealogy of the Russian imperial project and the resistance strategies of the countries drawn into its orbit. The presentation will examine the dialectic of the processes of modernization and internal colonization based on the research of Belarusian cinema and outline the problems of decolonization of Belarusian culture and education.

*Olena Khylko,* Comenius University

**How to ensure the long-lasting interest to the East European studies after re-centering them?**

It is the responsibility of the scholars to elaborate structural, epistemological and organizational transformations in academia and education to keep East European studies afloat after the Russia-Ukraine war is over.

In the paper, I will sustain introduction of epistemological diversity in the field studies predominantly by application the postcolonial studies to the states of the region and extending interdisciplinarity by enriching the field study with economic, IR, environmental and energy studies that in its turn would boost the region's agency. Providing the opportunity to replicate the experience of East European states (i.e., Ukraine has presented a fruitful ground for replication

postcolonial transition experience to other regions) will ensure interest of the western academia to the region for epistemological motives. While decolonization of East European and Russian studies with the re-centering to less visible silent state is inevitable, the risk of normalization and return to traditional study of the region via Russo-centric lens will surge as soon as the war ends.

To allow global academic community to benefit from using and application the study of the region for other segments of area studies the following considerations are suggested: stop exploiting victimhood of the region and presenting it as an object of great powers'/empires politics and boost the image of region's and state's agency that has always been diffused by Russo-centric lens; emancipate regional studies via disintegration of Russia, Eurasian and East European studies in both educational and research programs (predominantly immanent to the US academia) that would help to attract those scholars and students who are interested strictly in study the region without Russian lens; re-balance improper focus on the study of Ukraine's nationalism; bridge the approaches to the region in Western, Eastern Europe and North America.

*Tatsiana Kulakevich*, University of South Florida

**Breaking with the Past: Comparing Nation-Building in Belarus and Ukraine and its Role for Postcolonial Education**

The presidential election of 2020 turned into a fundamental institutional crisis that unleashed a process of national awakening in Belarus leading to the rise of a new sovereign nation that demands the right to determine its own future, independent of geopolitical pressures and interference. Similarly, Russia's attack on Ukraine in 2022 has galvanized a sense of Ukrainian national pride and resolve, which Ukrainians express by continuing to fight for their country despite massive losses. I argue the presidential election of 2020 in Belarus and Russian invasion of Ukraine served as critical junctures for the respective countries galvanizing national pride and creating the foundation for an opportunity not to be discriminated on national origin or be denied the right to learn in native language. However, unlike Ukraine, where national pride has been cultivated from within, a new ethno-national identity that emerged in Belarus under the historic white-red-white symbols, sharply contrasted with the official red and green colors of the regime was forced outside the borders. This new "awakening", however, and a culture built around it cannot be unlearned and should keep people ready to strike when the international political opportunity structure finally opens.

*Tamara Martsenyuk*, University of Kyiv-Mohyla, Leuphana Universität Lüneburg

**Ukrainian studies in times of war: challenges and opportunities**

I plan to analyze the current state of Ukrainian studies in and outside Ukraine in the context of the ongoing Russian invasion. Via exploring the voices of Ukrainian researchers from different disciplines, I want to discuss new challenges and opportunities that they face under full-scale invasion conditions. As a case study of current topics of research, I take a special issue "Understanding Ukrainian Society: Before and After the Russian Invasion" of the European Societies journal where I am a guest editor.

*Syeda Masood,* Brown University, Central European University

**Frantz Fanon and Ali Shariati's Theories of Self-Colonization: The Case of the Highly Educated**

Education is taken as a good thing in itself. Although there are benefits to education, the question arises - what is the relationship between modern education (which was developed and propagated around the world during the colonial period) and contesting coloniality and imperial power. Several scholars with anti-colonial views have discussed this using the case study of intellectuals in the colonized and post-colonial world. Explicating the thought of Martiniquian scholar Frantz Fanon and Iranian scholar Ali Shariati, in this paper, I show that for both of them intellectuals had a tendency towards self-colonization. I specifically rely on The Wretched of the Earth by Fanon and Where Shall We Begin by Shariati. For Fanon, the intellectuals were caught between two worlds, their own society, and the ideas of the colonizer society. When they fight the dominant, they hold on to any shred from the history of their society but think of their own society in national terms. This is problematic as the national borders themselves are actually made by the colonizer. This Fanon argues is the dilemma of the colonized intellectual. For Shariati, progressive scholars were cut off from the proletariat of their own society. Instead of helping their societies awake to coloniality and contest it, Shariati believed they aped the colonial powers in their thinking by copying theories developed for Western Europe without understanding their own history and context. Intellectuals thus need to get closer to the common people of their society instead of looking down upon them. In short, for both Fanon and Shariati, colonization and empire were not just about power and economy but the epistemic control of the minds of the dominated – especially the highly educated.

Keywords: Self-colonization, Intellectuals, Frantz Fanon, Ali Shariati, anti-colonialism

*Palina Prysmakova*, Florida Atlantic University

**Decolonization through the modernization of civil service education system**

The stagnation of Belarusian public administration and the lack of any significant administrative reforms have placed the Belarusian population, which is ready for change, in the decision-making trap of Moscow. After initial steps toward democracy, the country reverted into highly centralized administration with almost no change from the former communist values and operating styles.

Despite the creation of the Public Administration Academy, that institution acts in the manner of the country's dictatorial ruler and Moscow dependee Aliaksandr Lukashenka, for whom it is named. The academia has been kept isolated from the outside world and its progress and development in public management and administration. It has been completely disconnected from international and even regional professional research and educational societies. The educational materials come almost exclusively from Russia, in Russian language, and imbued with Moscow's ideology and the nostalgia for the lost power.

Thus, there has been little surprise that when in 2020 millions of Belarusians came out in the peaceful marches, it has been mostly the public sector's top executives who with the force and fear and by executing their administrative powers blocked this popular protest movement, and punished everybody who had something to do with it. The question remains, however, how much of this behavior was actually "their fault", if they had no access to knowledge other than "Russian", and had been trapped for decades in the artificial fear of the unknown, of the outside world, which Moscow has been masterfully using as a convenient tool to keep Belarus as an ally.

*Mariya Rohozha, Olena Pavlova*, Taras Shevchenko National University of Kyiv

**Teaching and researching the memes of war in Ukraine as way for the decolonization of education**

Since the beginning of the full-scale invasion of Russian troops into Ukraine, February, 2022, Ukrainians have become involved in various forms of cultural confrontation and resistance as the modus of postcolonial struggle against enemies. Among such forms of struggle is meme-practice on the topic of war.

After all, by ridiculing the enemy, Ukrainians get a positive experience of interacting with a stranger, scaling this image.

Within the paper it is planned to:

- clarify the classification of forms of humour and comic techniques in meme practices;

- research the basic themes, visual means and linguistic methods in correlating plot development and affect production. To study the transformations of visual, verbal and acoustic modes of narratives in audiences of different linguistic groups and cultural spaces for teaching. The research includes three levels of cross-cultural analysis: a) Russian narratives in Ukrainian memes (traumatic level); b) memes' text shifting in other language and audiences concerning perception of Ukrainian situation (communication in the context of reception of therapeutic experience of Ukrainian resistance to Russian neocolonialism); and c) ways of conceptualization of research communities of meme practices, their therapeutic effects and ethical meanings.

- analyse the conditions of meme series shaping as a form of narrative differentiation (Vladimir Propp's morphology and semantic processing) as well as ways of their conceptualization and interpretation. To analyse which parameters of memes are linked to the differentiation of traumatic and therapeutic modes in the logic of series reconstruction.

- consider the prospects for the systematic use of meme classifications in teaching students (bachelor and master students) of Cultural Studies and Humanities programs, taking into account online or offline learning;

- develop strategies for studying meme-practices for graduate students in their dissertation work and teaching practice.

*Anton Saifullayeu*, University of Warsaw

**Epistemological deadlock of decolonization in Eastern Europe. Comparison of the cases of Belarus and Ukraine.**

Decolonization is a complex process with a synchronous dynamic that undermines existing knowledge. In certain cases, it requires both internal and external impulses to overcome the epistemological impasse within a particular society. Overcoming colonial knowledge is a profound epistemological problem faced by Ukraine and Belarus in their decolonization processes. And at the center of this problem for Ukraine and Belarus is participation in global (colonial) knowledge.

Post-Soviet decolonization projects are prone to an internal positivism based on a radical binary of rejection and acceptance of the colonizer's identity.

At the same time, internal positivist conceptualizations of the national do not violate the epistemological integrity of colonial knowledge (e.g., the narration of the past, political culture, the vertical relationship of power to society). At the same time, the potential of such internal projects is completely insufficient to fit into the Western epistemological picture.

In fact, there is no universal decolonization strategy at all. For instance, the Ukrainian approach to decolonization from above implies a reverse dependence on the West in discursive terms. This means that Ukraine seeks external legitimization in the Western coloniality system as it undermines the principles of modern knowledge. That is, Ukrainian decolonization is basically an attempt to incorporate local subjectivity into Western epistemology. In contrast, the Belarusian case is more vulnerable since there are currently no preconditions for the emergence of Belarusian subjectivity within global knowledge.

*Liliana Tymchenko*, European Humanities University

**Decolonization: Peculiarities of Teaching International Law at the European Humanities University**

Traditionally, the international lawyer associates the term "decolonization" with the adoption of the Declaration on the Granting of Independence to Colonial Countries and Peoples of 1960 and the fact that the State of Palau joined the UN in 1994, indicating the end of the decolonization process. At the same time, a more or less broad idea of the real scale of the colonization of thinking comes only today, when humanity is faced with a full-scale military invasion of Russia on the territory of the largest European state - Ukraine.

We have witnessed the gradual rediscovery and recovery of real decolonization and the breakdown of the very “colonial matrix” (Walter Mignolo) that aims to maintain an unequal distribution of resources and power, where international criminal justice is directed exclusively at developing countries (Fuad Zarbiyev).

Obviously, the final decolonization in international legal relations is impossible without the decolonization of international legal thought itself, which, in turn, is based on the liberation of human thought as such.

In this context, the teaching of international law becomes a process of constant scientific and practical research. What questions need to be solved by the teacher entering the classroom to the student? What additional work does a teacher of the European Humanities University need to work with - a university whose mission is at the first stage to restore the integrity of the independence of

human thought, and at the second stage to develop a person, his/her critical thinking, and strengthen the ideals of civil society?

Our presentation will consist of answers to questions such as:

1. What is "decolonization" in the international legal context today?
2. What is the essence of the philosophy of international law today?
3. What should the process of teaching international law at the European Humanities University look like?



**Праблемы беларускамоўнай адукацыі**

Адным з найбольш эфектыўных спосабаў папулярызацыі і развіцця беларускай мовы з'яўляецца яе выкарыстанне ў адукацыі.

У апошнія гады істотна знізілася доля беларускай мовы ў выкладанні ў школах і ВНУ, асабліва ў дакладных і прыродазнаўчых навуках. Дзяржаўная палітыка, нягледзячы на афіцыйны статус беларускай мовы, скіравана на русіфікацыю адукацыі. Колькасць беларускамоўных школ за апошнія гады скарацілася ў некалькі разоў. Выкладанне розных дысцыплін ва ўніверсітэтах ажыццяўляецца на рускай мове (за рэдкім выключэннем).

Зніжаецца колькасць абітурыентаў, што здаюць цэнтралізаванае тэсціраванне па беларускай мове. Доля такіх абітурыентаў у 2023 годзе, у параўнанні з папярэднімі гадамі, зменшылася прыкладна на чвэрць. Пры захаванні такіх тэндэнцый існуе вялікая рызыка страты беларускай мовы як сродку выкладання.

Падчас дыскусіі плануецца абмеркаваць шляхі і спосабы пашырэння беларускай мовы ў адукацыі. Дадзеная праблема будзе разглядацца ў разрэзе таго, што магчыма зрабіць зараз, і таго, што мы можам зрабіць у будучыні. У дыскусіі плануюць узяць удзел рэдактарка навукова-папулярнага зіна "Pamylka", выкладчыца фізікі Святлана Волчак і фізік-ядзершчык, рэпетытар фізікі Андрэй Пятроўскі. У якасці мадэратара і спікера - лінгвіст, выкладчыца беларускай мовы Марына Антанюк-Пруто."

**Культурологія як ризикований проєкт: ревізія постколоніального досвіду**

Культурологія як дисциплінарна сфера освіти й науки в Україні широко запроваджена одразу після проголошення незалежності. З одного боку, вона була частиною модернізаційного проєкту державної політики у

сфері гуманітарної освіти, а з іншого, перейняла порадянські і постколоніальні дискурсивні матриці з мінімальними шансами на формування питомої дослідницької ідентичності й адекватного їй освітнього профілю. Відтак постає питання, якою має бути ця сфера знання в сучасній Україні в умовах глибинних суспільних зрушень, культурних трансформацій та тривалої війни за незалежність? Чи може культурологія позбутись спадщини колонізованого наукового дискурсу? Який напрям її розвитку ми здатні сьогодні побачити й передбачити в рамках деколонізаційних процесів? Які важливі ідеї вона здатна пропонувати і які питання ставити? Які зв'язки з політичним та ідеологічним полем вона здатна вибудувати? І, зрештою, чи цей проєкт 1990-х є життєздатним, чи вже радше належить до історії?

**Westplaining and the War (Book discussion)**

"The aim is a discussion about the collected volume „ALLES IST TEURER ALS UKRAINISCHES LEBEN – Texte über Westsplaining und den Krieg" ("Everything Is More Important than Ukrainian Lives: Texts on Westplaining and the War," Berlin 2023), ed. by A. Konarzewska, S. Schahadat, N. Weller. The texts collected in this book offer insights into the debate on Westsplaining (mostly in the Germanophone sphere) that has been going on since February 24, 2022: texts about Western political naiveté, about Russian soft power in the cultural sphere, and about the colonial disregard for the right of "small nations" to self-determination.

"When the inhabitants of Ukraine, Belarus, the Czech Republic, Poland or the Baltic states listen today to German celebrities who, without the slightest embarrassment, question Ukrainian statehood, national identity or even the right to self-determination, they have good reasons to ask uncomfortable questions. Is it just a lack of expertise in Ukrainian history, language and culture, or the internalized Western Europe-centric, colonial conviction that the law of the strongest is acceptable in Europe after all, as long as only the exotic "seasonal states" somewhere in the East are suffering as a result?" (From: "Introduction: War, Ignorance, and Indignation")

Among contributing authors are: Victoria Amelina, Vasyl Cherepanyn, Claudia Dathe, Franziska Davies, Andrii Dostliev, Lia Dostlieva, Tomasz Kamusella, Botakoz Kassymbekova, Aliaksei Kazharski, Halyna Kruk, Kateryna Mishchenko, Matthew Omolesky, Oleksiy Panych, Andrii Portnov, Olga Radetzkaja, Oleksiy Radynski, Wolodymyr Rafejenko, Petro Rychlo, Oksana

Sabuschko, Boris Schumatsky, Marci Shore, Natalka Sniadanko, Timothy Snyder, Szczepan Twardoch, Serhij Zhadan."

**Decolonization of Belarusian civil service: Examples of Practice from Education Sector**

Decolonization of the country must include the changes in the arrangements and the processes of civil servants and public services across the board. In this discussion circle, we will go over already tested and newly proposed ways to update the processes in relation to the employees of the education sector. The discussion covers both of the obligatory schooling and higher education systems. In addition, the speakers will present their ongoing projects in those directions.